# ПТУШЫНЫЯ ПЕРАПЕВЫ



**Па гарызанталі: 3.** ... і Дзям'ян. Святыя, заступнікі курэй і «куратніка», апекуны кавалёў і вяселля; свята ў іх гонар адзначалася 14 ліпеня і 14 лістапада. **7.** Страва з дробных кавалачкаў мяса, рыбы або гародніны. **8.** Пеўня на зарэз нясуць, а ён крычыць «...». (прык.). **11.** Від тэатральнага мастацтва, у якім удзельнічаюць і хатнія птушкі. **12.** Пра таго, хто нясе з сабой ісціну, асвету (перан.). **13.** Курыца п'е, а на ... глядзіць (прык.). **16.** Высокая елка. **17.** Апошняя стадыя развіцця насякомых. **18.** Крык гусей. **19.** Забава, задавальненне. **21.** Старажытнагрэчаскі байкапісец. **22.** Камічнае ў чым-небудзь; гумар. **25.** У геалогіі перамяшчэнне часткі горных парод па трэшчыне. **26.** Пеўню ячменнае ... даражэйшае за жамчужыну (прык.). **28.** «На ... і куры нашы хочуць -\\Чарвей і крошак пашукаць». З байкі Я.Коласа «Баба і куры». **29.** Пусці куру ў градку — здзяўбе ўвесь ... (прык.).

**Па вертыкалі: 1.** Краіна, герб якой упрыгожвае выява пеўня. **2.** Міфалагічны цар птушак. **3.** Арэх какосавай пальмы. **4.** Добрая квактуха адным вокам ... бачыць, а другім — коршака (прык.). **5.** Вільготна, сыра. **6.** Тое, што і прыбор. **9.** Мяса-яйкавая парода кур, выведзеная ў Англіі. **10.** Прыйшлі куры на хаўтуры: ... памёр (прык.). **14.** Народная гульня ў мяч. **15.** Чужыя пеўні спяваюць, а на нашага ... напаў (прык.). **18.** У задзірыстага пеўня ... заўсёды ў крыві (прык.). **20.** Музычны твор, выканы ў паволным тэмпе. **22.** «... пра залатога пеўніка». Знаёмы кожнаму з дзяцінства выдатны твор А.Пушкіна. **23.** Гатунак, тып вырабу, тавару. **24.** Невялікая арганізацыйная ячэйка. **27.** Орган размнажэння ў грыбоў.

**Склаў Лявон ЦЕЛЕШ,**
*г. Дзяржынск.*

**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ**

**Па гарызанталі:** 3. Кузьма. 7. Рагу. 8. «Кукарэку». 11. Цырк. 12. Светач. 13. Неба. 16. Яліна. 17. Імага. 18. Гогат. 19. Уцеха. 21. Эзоп. 22. Камізм. 25. Скід. 26. Зярнятка. 28. Свет. 29. Агарод. **Па вертыкалі:** 1. Францыя. 2. Кук. 3. Какос. 4. Зерне. 5. Мокра. 6. Прылада. 9. Арпінгтон. 10. Верабейка. 14. Лапта. 15. Ціпун. 18. Грэбень. 20. Андантэ. 22. Казка. 23. Марка. 24. Звяно. 27. Аск.

# СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 4.58 | 21.34 | 16.36 |
| Віцебск — | 4.41 | 21.31 | 16.50 |
| Магілёў — | 4.48 | 21.23 | 16.35 |
| Гомель — | 4.53 | 21.12 | 16.19 |
| Гродна — | 5.15 | 21.48 | 16.33 |
| Брэст — | 5.24 | 21.40 | 16.16 |

**Месяц**

*Маладзік 16 ліпеня.*
*Месяц у сузор'і Льва з 17.14.*

**Імяніны**

***Пр.** Аляксандра, Анатоля, Васіля, Івана, Канстанціна.*
***К.** Марыі, Сцяпана.*



Фота Ліны МАЛІНІНАЙ.

# ЗАЎТРА




Даты | Падзеі | Людзі

**16 ЛІПЕНЯ**

**1054** год — адбыўся канчатковы раскол хрысціянскай Царквы — на рымска-каталіцкую і праваслаўную: рымскі папа Леў IX паслаў у Канстанцінопаль сваіх паслоў-легатаў на чале з кардыналам Гумбертам для вырашэння канфлікту, пачатак якому быў пакладзены закрыццём там у 1053 годзе лацінскіх цэркваў. Аднак прымірэння не адбылося, і 16 ліпеня 1054 года ў сабор Святой Сафіі папскія легаты абвясцілі аб дэтранізацыі Канстанцінопальскага патрыярха Міхаіла Кірулярыя і яго адлучэнні ад Царквы. У адказ на гэта 20 ліпеня патрыярх абвясціў анафему папу і яго легатам. Гэта і паслужыла прычынай расколу хрысціянскай Царквы, у выніку якога канчаткова адасобіліся: рымска-каталіцкая царква на Захадзе і праваслаўная — на Усходзе. Раскол меў мноства перадумоў і прычын, корань якіх — у абрадавых, дагматычных і этычных адрозненнях паміж заходняй і ўсходняй цэрквамі. Розныімі былі мовы набажэнстваў: латынь у заходняй царкве і грэчаская мова — ва ўсходняй. Акрамя таго, мелі месца маёмасныя спрэчкі, а таксама прамая барацьба папы рымскага і канстанцінопальскага патрыярха за першынство сярод іншых хрысціянскіх першасвятароў. Пакінуўшы Канстанцінопаль, папскія легаты выправіліся ў Рым акружным шляхам, каб апавясціць аб адлучэнні Міхаіла Кірулярыя іншых усходніх патрыярхаў. Яны наведалі і Кіеў, дзе сустрэліся з мясцовымі клірыкамі і былі прыняты пры князевым двары. Пры гэтым старажытнаруская Царква захавала прыхільнасць да праваслаўя. Царкоўны раскол не пераадолены да гэтага часу, хоць у 1965 годзе па рашэнні рымскага папы і канстанцінопальскага патрыярха ўзаемныя праклёны былі зняты.

**1940** год — нарадзілася (вёска Загор'е Баранавіцкага раёна) Ніна Загорская, беларуская паэтэса. Скончыла аддзяленне журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (1962). У 1973 годзе была накіравана на працу адказным сакратаром у рэдакцыю газеты «Зорька». З 1976 года — адказны сакратар рэдакцыі літаратурна-драматычных перадач Беларускага радыё, з 1980-га — намеснік галоўнага рэдактара літаратурна-драматычных праграм Беларускага тэлебачання, потым- загадчык аддзела навукі і мастацтва часопіса «Полымя», галоўны рэдактар рэпертуарна-рэдакцыйнай калегіі Міністэрства культуры БССР. Член Саюза пісьменнікаў СССР з 1982 г. У друку выступае з 1958-га. Аўтар зборнікаў вершаў «Радар», «Явар», «Мне добра з вамі». Асобныя вершы пакладзены на музыку. Выступае і як перакладчык, публіцыст, крытык.

**1944** год — на гарадскім іпадроме адбыўся святочны мітынг у гонар вызвалення Мінска ад нямецкіх захопнікаў і партызанскі парад. Сюды прыйшло каля 50 тысяч мінчан. Мітынг адкрыў старшыня гарвыканкама К.І. Бударын. Потым сакратар ЦК КП(б)Б Пантэляймон Панамарэнка павіншаваў усіх з вызваленнем горада, ад



імя ўдзельнікаў мітынгу і ўсяго беларускага народа падзякаваў войскам трох Беларускіх і 1-га Прыбалтыйскага франтоў. Пасля перад трыбунай прайшло каля 30 тысяч партызан з 30 партызанскіх брыгад і 2 асобна дзеючых атрадаў са зброяй, трафейнай тэхнікай і ўзбраеннем. Для ўдзелу ў парадзе і наступнага расфарміравання яны пачалі прыбываць у Мінск загадзя. У час вайны ў партызанскіх атрадах змагаліся 370 тыс. чалавек, больш за 60% тэрыторыі БССР было пад іх кантролем. Народныя мсціўцы пусцілі пад адхон 11 тыс. варожых эшалонаў і 34 бронецягнікі, знішчылі 305 самалётаў, 1355 танкаў і бронемашын, 125 тыс. салдат і афіцэраў гітлераўскай арміі.

**Было сказана**

**Аляксей ПЫСІН, паэт:**
*«Пакуль зямля твая жывая,*
*І ты — жывы!»*

**Азбука народнай культуры**

**ад Янкі Крука і Аксаны Катовіч**

**Л**АЗНЯ. У народных павер'ях лазня — неабходнае ў сялянскім быце ачышчальнае і аздараўленчае месца адначасова — стала прытулкам дэманічных істот. У лазні не толькі мыліся, але і выконвалі сямейныя абрады, напрыклад варажылі, нараджалі дзяцей.

У адносінах да лазні ў культуры славянскага народа было выпрацавана шмат правілаў, парушаць якія старыя людзі не раілі.

◈ Лічылася, што непаважлівыя адносіны да самой лазні і да яе духа — лазніка — адмоўна праявяцца на здароўі ўсіх членаў сям'і.

◈ У лазню ніколі не ўносілі крыжы і іконы, аднак перад уваходам у яе абавязкова хрысціліся.

◈ Кожны раз, калі пачыналі таліць печ, каб сагрэць лазню, у гаспадара-лазніка прасілі дазволу папарыцца — палепшыць здароўе. Апошні, хто выходзіў з лазні, павінен быў падзякаваць лазніку за «добры пар», або «лёгкі дух».

◈ У лазні забаранялася гучна размаўляць, спяваць, сварыцца.

◈ Не карысталіся лазняй у святочныя («святыя») дні, акрамя Чыстага чацвярга (чацвер перад Вялікаднем). У гэты дзень раніцай абавязкова ішлі ў лазню, каб змыць усе грахі.

◈ Абавязкова грэлі лазню перад вяселлем як для нявесты, так і для жаніха.

◈ На месцы былой (зруйнаванай, разбуранай) лазні ніколі не будавалі хату.

◈ Забаранялася ўваходзіць у лазню з «трэцім» парам або позняй ноччу: нашы продкі былі ўпэўнены, што ў гэты час парыцца сам лазнік.

◈ Аднак менавіта ноччу на Каляды дзяўчаты ішлі ў лазню варажыць на сваю будучыню, а ў якасці падарунка духу лазні прыносілі крыху салодкай кашы.

## УСМІХНЕМСЯ

**Калі варыць пельмені 20 хвілін, то гэта ўсё яшчэ пельмені, калі 40 хвілін, то гэта макароны па-флоцку, а калі 60 хвілін і пасыпаць сырам, то ўжо лазання.**

Пацыент прыходзіць да ўрача:

— Доктар, я сябе дрэнна адчуваю.

— Праглыніце гэтыя шрубы. Што-небудзь адчуваеце?

— Так, я адчуваю сябе горш.

— Усё зразумела — алергія на шрубы!

**Жанчыны раўнуюць, таму што ведаюць, на што здольны жанчыны.**

Адна матуля скардзіцца іншай:

— Васіль у нас — позняе дзіця: раней дванаццаці ночы дадому не прыходзіць.

**Сімпатычная жанчына з макіяжам — твор мастацтва, сімпатычная жанчына без макіяжу — цуд прыроды.**

Як дамагчыся сексу ад дзяўчыны?

1) Кахаць.

2) Даглядаць.

3) Дарыць кветкі і падарункі.

4) Нагадаць ёй, што яна — ваша жонка, у рэшце рэшт!




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, 287 17 21, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.569. Індэкс 63850. Зак. № 2814.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 15 ліпеня 2015 года.